тапісы былі завяршальным этапам у гісторыі летапісання Беларусі.

Прыярытэт у справе адкрыцця і ўвядзення ў навук. ўжытак Л.б. належыць І.Даніловічу, які ў 1823—24 упершыню апублікаваў тэкст Бел.-літоўскага летапісу 1446 (паводле Супрасльскага спісу) і шэраг артыкулаў. Іх даследавалі С.Смолька, Ф.Сушыцкі, І.А.Ціхаміраў, А.А.Шахматаў, Я.Якубоўскі і інш. Л.б. вывучалі і вывучаюць бел. (М.М.Улашчык, В.А.Чамярыцкі), літоўскія (М.Ючас) і інш. даследчыкі. Захавалася каля 50 спісаў гэтых твораў, большасць з якіх зберагаецца ў Маскве і С.-Пецярбургу. *В.А.Чамярыцкі.*

**ЛЕ́ТКА** Іван Антонавіч (14.6.1935, б. маёнтак Масаляны, Берастравіцкі р-н — 23.8.1999), беларускі паэт. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1967). Лейтматыў творчасці Л. — паэтызацыя працы як крыніцы чалавечага хараства. Яркая метафарычнасць спалучаецца ў ёй з рэаліст. канкрэтнасцю назіранняў. Аўтар паэт. зб-каў «Тры крокі ад сонца» (1967), «Тры верасні» (1970), «Грамы на зімоўцы» (1974), «Агні ў пралётах» (1991), паэмы «Каліноўцы» (1974) і інш. *А.М.Пяткевіч.*

**ЛЕ́ТНІЯ ПЕ́СНІ**, цыкл усходнеславянскага, у т.л. і бел., каляндарнаабрадавага фальклору, які прымеркаваны да летняй працы земляроба. Уключаюць маляўнічыя паводле зместу *купальскія песні* і *пятроўскія песні*, у якіх паэтызуецца хараство прыроды, прасочваюцца матывы кахання, клопат селяніна аб добрым ураджаі. Атмасферу цяжкай працы, быт. клопатаў перадаюць *касецкія песні*. Значнае месца ў іх займаюць вобразы сонца, ветру, лугу, што арганічна спалучаюцца з любоўнымі матывамі. Завяршаюць цыкл Л.п. *жніўныя песні*. Гал. іх вобразы — жняя, месяц, поле, сонца, вячэрняя зара і інш. — дапамагаюць падкрэсліць эстэтычную значнасць нялёгкай працы жанчыны-жняі на ніве. Многія Л.п. характарызуюцца велічальнымі матывамі, перадаюць радасць з нагоды заканчэння цяжкай працы, якая абумовіць заможнасць роду, сям'і.

*Літ.*: Л і с А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў: эстэтычны аспект. Мінск, 1998. *А.М.Аляхновіч.*

**ЛЕ́ТНІЯ СВЯ́ТЫ, АБРА́ДЫ, ЗВЫЧАІ**, цыкл абрадавых дзей ва ўсх. славян, у т.л. і беларусаў, звязаных з прац. дзейнасцю земляроба. Асн. сярод іх лічыліся *жніўныя абрады*, што ўключалі ў сябе звычаі *Зажынак* і *Дажынак*, *Купалле*, святочныя звычаі *Пятра*, *Кузьмы і Дзям'яна*, Серпавіцы, *Ільі*, Макавея, мядовага, яблычнага і хлебнага *Спаса*. Першым па часе ішло свята Купалле, у якім захавалася шмат язычніцкіх вераванняў, паданняў, легенд: вера ў незвычайную сілу купальскага агню, паданне пра вогненную папараць-кветку, спальванне і тапленне ў вадзе лялькі Купалы ці Мары, варажба на вянках і інш. У гэтую чароўную ноч, калі моладзь наладжвала гульні і забавы, сталыя людзі выконвалі разнастайныя абрадавыя дзеянні, накіраваныя на засцярогу ад шкоды сям'і, жывёлы, пасеваў: вешалі на хлявах крапіву і вянкі з асвячоных траў, каб ведзьма не магла адабраць у кароў малако, затыкалі ўсе дзіркі ў хаце і хлявах, распальвалі маленькія кастры каля сваіх сядзіб, каб загарадзіць уваход нячысцікам, кідалі ў жыта галавешкі з купальскага вогнішча. Пара касьбы вылучалася ў асноўным характарам *касецкіх песень*, у якіх адбіліся тэма кахання і сямейна-быт. матывы. Сабраная на сенакос талака абвязвала гаспадара скручаным з сена вязьмом і патрабавала выкуп за працу. Да жніва, якое з'яўлялася вынікам шматдзённай працы сялян, рыхтаваліся як да вял. свята: прыбіралі падворак, гумно, хату, засцілалі стол белым абрусам. Напярэдадні аглядалі ніву, адзначалі, ці паспеў колас, ці можна жаць, ці ёсць у жыце заломы. Магічнае значэнне меў першы зжаты сноп («гаспадар-сноп»), які захоўваўся на покуці сялянскай хаты да Дажынак, і зерне якога пасля абмалоту асвячалі на *Прачыстую*, каб засеяць ім поле на наступны год. Заканчвалі жніво абрадам «*Завіванне барады*», качаннем жнеек па ніве, каб атрымаць ад яе страчаную сілу, і заключнай «талочнай» вячэрай з ужываннем абрадавых страў — бліноў і густой кашы. На Яблычны Спас асвячалася садавіна, пасля чаго яе можна было спажываць. Заключным для летняга перыяду і адначасова першым восеньскім святам, што завяршала земляробчыя працы, лічылася свята *Багач*. Амаль усе рытуалы летніх свят суправаджаліся абрадавымі і пазаабрадавымі песнямі, што надавалі ім адпаведную значнасць, тлумачылі сімволіку, дапамагалі зразумець міфал. язычніцкую аснову святочных дзей. Дзякуючы фалькл. творам летнія каляндарныя традыцыі выкарыстоўваюцца ў наш час прафес. і аматарскімі калектывамі, задавальняючы маст. густы гледачоў.

*Літ.*: Л і с А.С. Купальскія песні. Мінск, 1974; Я г о ж. Жніўныя песні. Мінск, 1993; Я г о ж. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў: эстэтычны аспект. Мінск, 1998; Купальскія і пятроўскія песні. Мінск, 1985. *А.М.Аляхновіч.*

**ЛЕ́ЎЧАНКА** Зінаіда Мікалаеўна (3.3.1925, г. Новачаркаск, Расія — 16.5.1980), беларускі архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1971). Скончыла Харкаўскі інжынерна-буд. ін-т (Украіна, 1949). З 1975 працавала ў ін-це «Брэстграмадзянпраект». Асн. работы ў Брэсце: жылы дом на пл. Леніна (1959), кавярня па вул.



*З.М.Леўчанка.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ